International Accountability Platform for Belarus

**НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ЎСЕ ПЕРАШКОДЫ, ПЛАТФОРМА IAPB УЗМАЦНЯЕ БАРАЦЬБУ ЗА СПРАВЯДЛІВАСЦЬ У БЕЛАРУСІ**

28.05.2025

У перыяд з кастрычніка 2024 года па сакавік 2025 года парушэнні правоў чалавека ў Беларусі па-ранейшаму заставаліся на трывожным узроўні, з сістэматычнымі рэпрэсіямі за рэальнае ці меркаванае палітычнае іншадумства. Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці ў Беларусі (Платформа) і шматлікія праваабарончыя арганізацыі задакументавалі дзеянні, якія могуць быць кваліфікаваныя як злачынствы супраць чалавечнасці, паводле апошняй справаздачы аб ходзе работы Платформы.

Прэзідэнцкія выбары 26 студзеня 2025 года, у выніку якіх Аляксандр Лукашэнка быў абраны на сёмы тэрмін на фоне масавых абвінавачванняў у фальсіфікацыі выбараў, яшчэ больш умацавалі аўтарытарны кантроль і ўзмацнілі палітычныя рэпрэсіі.

*"Нягледзячы на значныя палітычныя перашкоды, Платформа IAPB застаецца цвёрда адданай справе садзейнічання правасуддзю для пацярпелых і забеспячэння адказнасці за парушэнні правоў чалавека і міжнародныя злачынствы ў Беларусі",* - заявіла Андрэа Хубер, кіраўнік Платформы IAPB. *"Аднак справядлівасць у Беларусі не пераможа без пастаяннага міжнароднага ціску і ўвагі".*

У справаздачны перыяд беларускія ўлады ўзмацнілі рэпрэсіі:

- Праваабарончы цэнтр "Вясна" зафіксаваў 2 958 палітычна матываваных затрыманняў і судовых працэсаў.
- У зняволенні заставаліся 1 205 палітычных вязняў, у тым ліку вядомыя праваабаронцы.
- Сілавікі мэтанакіравана пераследвалі ўдзельнікаў мінулых пратэстаў, каб запалохаць людзей перад выбарамі.
- У "экстрэмісцкі" спіс уключылі 511 чалавек, і прызналі “экстрэмісцкімі” яшчэ 19 арганізацый.
- Паведамлялася аб двух выпадках смерці ў месцах зняволення і аб бесчалавечных умовах утрымання пад вартай.
- Затрыманыя, у тым ліку жанчыны, падвяргаліся пагрозам сэксуальнага гвалту і разлучэння з дзецьмі.
- Свабода прэсы і права на абарону былі сур'ёзна абмежаваныя: у зняволенні знаходзіўся 41 журналіст, а прынамсі пяцёра адвакатаў былі пазбаўленыя права займацца адвакацкай дзейнасцю.

Рэпрэсіі рэжыму выйшлі за межы Беларусі. Зафіксавана 24 завочных судовых працэсы, а прынятыя ў лютым 2025 г. папраўкі да Крымінальнага кодэксу пашырылі сферу іх прымянення, што выклікала сур'ёзную заклапочанасць у галіне правоў чалавека. Таксама ўзмацнілася сачэнне за беларускімі эмігрантамі, якія ўдзельнічаюць у апазіцыйнай дзейнасці.

*"У адказ на гэта Платформа працягнула сваю надзвычай важную працу па зборы доказаў і забеспячэнні прыцягнення вінаватых да адказнасці",* адзначыў Павел Сапелка, прадстаўнік арганізацыі "Вясна", сузаснавальніка Платформы. *"За апошнія шэсць месяцаў было сабрана 76 новых сведчанняў, якія папоўнілі закрытую базу дадзеных, што змяшчае ўжо 2775 сведчанняў".*

На сённяшні дзень Платформа сабрала больш за 30 000 дакументаў, якія тычацца сведак, і 1,5 мільёна матэрыялаў з адкрытых крыніц, якія могуць быць выкарыстаны ў судовых расследаваннях. Працягваецца аналіз доказаў датычнасці з мэтай выяўлення ланцужкоў камандавання, якія злучаюць высокапастаўленых службовых асоб са злачынствамі, здзейсненымі іх падначаленымі.

Сярод задакументаваных парушэнняў -- фізічнае і псіхалагічнае жорсткае абыходжанне, сексуальны і гендарны гвалт, магчымыя незаконныя забойствы, бесчалавечныя ўмовы ўтрымання пад вартай, а таксама парушэнні права на належнае судовае разбіральніцтва і іншых асноўных правоў.

"*Платформа па-ранейшаму адданая справе падтрымкі пацярпелых*",- заявіла Вікторыя Фёдарава, прадстаўніца Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі, сузаснавальніка Платформы. "*На працягу справаздачнага перыяду яшчэ 88 пацярпелых атрымалі псіхалагічную і псіхасацыяльную падтрымку, што яшчэ раз пацвердзіла нашу прыхільнасць падыходу, арыентаванаму на пацярпелых*".

У рамках сваёй працы па падтрымцы нацыянальных і міжнародных намаганняў па забеспячэнні адказнасці Платформа ў студзені 2025 года, услед за зваротам Літвы ў Міжнародны крымінальны суд з нагоды сітуацыі ў Беларусі, прадставіла ў МКС даклад аб магчымых злачынствах супраць чалавечнасці ў Беларусі. Яна таксама аказала дапамогу пракурорам у дзвюх юрысдыкцыях, у выніку чаго агульная колькасць пададзеных ёю прадстаўленняў дасягнула дзевяці ў пяці краінах, і паглыбіла супрацоўніцтва з Групай незалежных экспертаў ААН па правах чалавека ў Беларусі (ГНЭБ), якой было перададзена больш за 1500 файлаў.

**Аб Платформе:**

Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (IAPB), створаная ў сакавіку 2021 года, -- гэта кансорцыум беларускіх і міжнародных НДА, які збірае, кансалідуе, верыфікуе і захоўвае доказы грубых парушэнняў правоў чалавека, меркавана здзейсненых беларускімі ўладамі і іншымі асобамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх.

**Для атрымання дадатковай інфармацыі, калі ласка, звяртайцеся да Андрэа Хубер, кіраўніка Платформы IAPB**, anhu@dignity.dk.

Спампаваць справаздачу аб ходзе работы